# *VATES* У ПАЭМАХ «ПРУСКАЯ ВАЙНА» Я. ВІСЛІЦКАГА І «РАДЗІВІЛІЯДА» Я. РАДВАНА

## А. В. Варывончык

Вобраз песняра-прарока (лац. vates) набыў значнае пашырэнне ў беларускай паэзіі перыяду нацыянальнага адраджэння, у прыватнасці, у творчасці М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа і фактычна ў маштабах беларускага пісьменства дасягнуў узроўню мастацкага канцэпту. Аднак тыпалагічна роднасныя вобразы прадстаўлены і ў шматмоўнай паэзіі Беларусі эпохі Рэнесансу. У нашым даследаванні мы прадставім два ўвасабленні мастацкага канцэпту *vates*, якія фігуруюць у помніках лацінамоўнага эпасу XVI ст.

Лацінскае слова *vates* акумулюе ў сабе тры значэнні: 1) ‘прадказальнік, прарок’; 2) ‘натхнёны пясняр, паэт’; 3) ‘настаўнік, карыфей’. Прасочым, якім чынам рэалізуецца канцэптуальная семантыка *vates* у двух помніках гераічнага эпасу Беларусі: «Прускай вайне» Яна Вісліцкага і «Радзівіліядзе» Яна Радвана.

У паэме «Пруская вайна» (1516) у ролі *vates* выступае Апалон. У антычнай міфалогіі гэта – бог сонца і свету (Феб), мудрасці, прадбачання, сын Зеўса і багіні Лета (Латоны), бацька Арфея, Ліка і Асклепія, брат Артэміды [2, с. 26]. Апалон з’яўляецца таксама богам гармоніі, духоўнай дзейнасці і мастацтва, перш за ўсё музыкі, спеваў; ён – кіраўнік дзевяці муз. Таму яго часта выяўлялі з лірай, кіфарай у руках, якую ён атрымаў ад Гермеса [6, с. 41].

Я. Вісліцкі, расказаўшы чытачу пра Палонію, людзей, якія там жывуць, а таксама пра іх суседзяў, прадставіўшы першых легендарных валадароў Палоніі Леха, Крака і Ванду, звяртаецца па дапамогу да Музы Каліопы і старажытнай Славы, бо хоча далей прадставіць радавод князёў і каралёў краіны. Аднак раптам да яго з’яўляецца Апалон-Цынтыец, *сам натхняльнік паэтаў*, і раіць аўтару-апавядальніку перапыніць аповед, спасылаючыся на яго малады ўзрост: *Не пасуе бо ўзросту твайму маладому // Справа такая, і ты не адолееш гэткіх вышыняў…* [1, с. 206]. Апалон сцвярджае, што гэту справу ажыццявяць іншыя творцы, а аўтару «Прускай вайны» натхняльнік паэтаў даручае апець Жыгімонта і яго дзеда Ягайлу: *Ёсць жа і будуць паэты – яны нам пазней і пакажуць // Тых каралёў, што суровы сармат услаўляе. // Ты ж лепей Продка славутага польскага валадара апявай нам, // Слаўныя дзеі яго знакамітага дзеда, якія // Прусія ў бітвах крывавых адчула сваім паражэннем* [1, с. 206]. Такім чынам, у «Прускай вайне» Апалон выступае як мудры дарадца, настаўнік, кіраўнік пісьменніцкай думкі.

Паэма Я. Радвана «Радзівіліяда» (1592) прэзентуе іншую іпастась *vates* – антычнага песняра Мусэя, міфічнага спевака, паэта, прадказальніка, любімага вучня (або сына) Арфея [3, с. 133].

Увагу чытача ў сваёй паэме Я. Радван засяроджвае на гадах выхавання Мікалая Радзівіла. Значную ролю тут якраз адыгрывае «папярэднік Гамера» Мусэй, [4, с. 128], які з'яўляецца апекуном, настаўнікам будучага гетмана. У гэтай частцы аўтар, як і Ф. Градоўскі ў «Апісанні маскоўскага паходу Хрыстафора Радзівіла», акцэнтуе ўвагу на пастулаце, што сапраўдныя мужныя ўчынкі магчымыя толькі праз выхаванне мастацтвам прыгожага слова: *Так найлепшым прыгожым мастацтвам // Мужны гартуецца дух для высокіх геройскіх учынкаў* [5, с. 440]. Мікалай Радзівіл адпраўляецца да Кастальскай крыніцы, дзе *І Мусэй, і Арфей з захапленнем // Слухалі Музаў – яны ж аянійскі напой ім давалі, // Голас адна за другой заплятаючы ў дзіўную песню* [5, с. 441], каб паслухаць мудрага настаўніка, каб адчуць сівую мінуўшчыну. Мусэй паўстае перад намі ў *шатах святарскіх годны і паважны…*» [5, с. 441] і звяртаецца да юнага Радзівіла, падрыхтоўвае яго да ўспрыняцця мудрых парад: *Буду цябе я вучыць, настаўляючы словам праўдзівым: // Станься падобным багам, ды не толькі душы несмяротнай – // Целу настолькі ж спрыяй, развівай – хай смяротныя! – члены! // Праведнік можа чакаць благаславёную радасць па смерці* [5, с. 441].

Мусэй нагадвае, што *жыццё – толькі момант, імгненне*, таму яго не трэба марнаваць на бязглуздыя і неабдуманыя ўчынкі, а трэба быць разважлівым, звяртаць свой розум у неба, да Бога, бо шчырая вера можа ачысціць і асвятліць думкі, дапамагчы выйсці з цяжкіх сітуацый: *Марная пыха людзей! О бязбожныя грэшныя душы! // Колькі пустога ўсяго выяўляецца ў думках і ў справах! // Людзі, бяссаўныя вы! Што за сорам! Ніякай вам славы! // Гэй! Падыміся з зямлі да дабротаў нябеснай айчыны* [5, с. 442].

У сваёй прамове Мусэй акцэнтуе ўвагу Радзівіла на асноўных якасцях, якія павінен выхоўваць у сабе мужны абаронца сваёй краіны: *Смела й цвёрда за мір выступай, супраць звады, заганаў! // Будзь абаронцам Айчыны і носьбітам высакародства! // Хай Дасканаласць цябе дабрачыннай аздобнасцю вабіць, // Будзь годны продкаў сваіх мужнай справай, набожнасцю чыстай. <…> // Дбай пра Айчыну сваю, ды не толькі ў прыгожых прамовах. // Хай падкрадзецца бяда: запануюць лянота ці пыха, – // Будзь для Айчыны абранцам, і бацькам, і грамадзянінам. <…> // Пільна не пніся, не лезь на вяршыні напышлівай славы: // Міру больш прагна жадай, чым трыумфаў любой перамогі* [5, с. 443–444].

Тут Мусэй яшчэ раз падкрэслівае значнасць спасціжэння прыгожага мастацтва, паэзіі: *Так што спяшайся чытаць старадаўніх аналаў старонкі, // Творы паэтаў, – у іх каралі, валадарствы і войны…* [5, с. 444].

У сваёй паэме Я. Радван прадстаўляе Мусэя не толькі ў якасці песняра, але пазіцыянуе яго як мудрага настаўніка, выхавацеля, як зямнога апекуна, натхняльніка гетмана Мікалая Радзівіла. Менавіта ён дае герою значныя жыццёвыя парады, накіроўвае на правільны шлях, засцерагае і ахоўвае.

Такім чынам, *vates* (Апалон і Мусэй) у паэмах Я. Вісліцкага «Пруская вайна» і Я. Радвана «Радзівіліяда» выступае не столькі ў функцыі прарока, песняра, паэта, колькі ў функцыі мудрага настаўніка, дарадцы, які вядзе за сабой і не дае сысці з правільнага шляху. Канцэптуальнае ўвасабленне *vates*, а таксама яго функцыянальнае значэнне выяўляюць выразную дыдактычную і выхаваўчую скіраванасць гераічнага эпасу Беларусі эпохі Рэнесансу.

**Літаратура**

1. *Вісліцкі Я.* Пруская вайна // Літаратура XI–XVI стст. / Уклад. і камент. А. У. Бразгунова, І. У. Будзько, Л. В. Ляўшун; прадм. У. В. Гніламёдава; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мінск, 2011. С. 198–221.
2. *Лисовой И. А., Ревяко К. А.* Античный мир в терминах, именах и названиях: Словарь-справочник по истории и культуре Древней Греции и Рима / Науч. ред. А. И. Немировский; предисл. Г. И. Шевченко. Минск, 1996.
3. Мифологический словарь / М. Н. Ботвинник, М. А. Коган, М. Б. Рабинович, Б. П. Селецкий. Минск, 1989.
4. *Некрашэвіч-Кароткая Ж. В.* Беларуская лацінамоўная паэма: позні Рэнесанс і ранняе Барока / Навук. рэд.: В. П. Рагойша, У. Г. Кароткі. Мінск, 2011.
5. *Радван Я.* Радзівіліяда, або Пра жыццё і дзеі, слаўныя подзвігі бессмяротнай памяці найсвятлейшага пана Мікалая Радзівіла // Літаратура XI–XVI стст. / Уклад. і камент. А. У. Бразгунова, І. У. Будзько, Л. В. Ляўшун; прадм. У. В. Гніламёдава; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мінск, 2011. С. 433–460.
6. Словарь античности / Пер. с нем. М., 1989.

## ПАЛІТЫЧНАЯ ПАЛІТРА РЫМА Ў ЭЛЕГІЯХ АВІДЗІЯ: НАЙБОЛЬШ ЗНАКАМІТЫЯ АДРАСАТЫ

**А. С. Герус**

Яшчэ да выгнання творчасць Авідзія мела да палітычных падзей даволі пасрэднае дачыненне: яны ніколі не цікавілі паэта, а ён сам не імкнуўся займаць кіруючыя пасады, падымаючыся па сваім cursus honorum. Палітыка прысутнічала ў творах паэта ў якасці фону для сюжэтаў і не атрымлівала ў яго элегіях ці паэмах цэнтральнага месца.